разважлівасць і розум сталага мужчыны, роздумы і заўвагі чалавека мудрага. У цэлым, філасофская лірыка Леаніда Якубовіча складае агромны і важкі пласт у яго творчасці. Паэт пакінуў нам, нашчадкам, залатую спадчыну, якая застанецца і будзе не адзін век дапамагаць нам знайсці адказы на свае ўласныя пытанні.

## ГІСТАРЫЧНАЯ СПАДЧЫНА МІНСКА

УА “Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”
**Сіўцэвіч Л.В., 2 к., 5 гр., МПФ**
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – ст. выкл. Варанец В.І.

Сталіца Беларусі Мінск - адзін з самых старажытных еўрапейскіх гарадоў. Напярэдадні Міжнароднага дня помнікаў і гістарычных мясцін, што адзначаецца 18 красавіка, аўтар шматлікіх навуковых і краязнаўчых публікацый, прысвечаных мінуламу Мінска, гісторык Уладзімір Дзянісаў адзначае, што, на жаль, у горадзе з тысячагадовай гісторыяй старажытных помнікаў архітэктуры засталося няшмат.

У асноўным гэта камяніцы і сакральныя будынкі, якія змешчаны на тэрыторыі Ракаўскага і Траецкага прадмесцяў, а таксама Верхняга горада, які пачаў фарміравацца ў XVI стагоддзі пасля Вялікага пажара, бо да гэтага горад быў фактычна ўвесь драўляны, і менавіта на гэтым месцы паўсталі першыя мінскія камяніцы.

Самым старажытным будынкам Мінска мог бы стаць праваслаўны храм XI-XII стагоддзя. Яго падмуркі захаваліся да сёння і знаходзяцца зараз пад зямлёю на тэрыторыі Мінскага замчышча (раён Плошчы 8 сакавіка). З тых жа будынкаў, што мы можам пабачыць, самымі старажытнымі з'яўляюцца:

**1. Свята-Пятра-Паўлаўская царква**

Лічыцца, што Петрапаўлаўская царква на Нямізе была заснавана ў 1612 г, алё некаторыя даследчыкі гэтую дату ставяць пад сумнеў. Тым не менш большасць гісторыкаў схіляецца да таго, што гэты будынак быў узведзены ў час першага пажару XVII стагоддзя. У савецкія часы тут месціўся архіў, у 1991-м богаслужэнні ў царкве былі адноўлены.

**2. Свята-Духаўскі манастыр базыльянак**

На тэрыторыі сучаснай Плошчы Свабоды, па вуліцы Энгельса, 1, захаваўся будынак Мінскага Свята-Духаўскага манастыра базыльянак. Будынак, у якім цяпер знаходзіцца дзіцячая музычны школа № 10 імя Глебава, быў заснаваны ў 1641 годзе. Алё яго можна лічыць і значна



Репозиторий ГрГМУ

старэйшым, магчыма, нават найстарэйшым у Мінску. У канцы XX стагоддзя пры падрыхтоўцы праекта работ па рэстаўрацыі будынка высветлілася, што да пабудовы манастыра на яго месцы знаходзіліся мураваныя дамы мінскіх мяшчан. І рэшткі мінімум трох дамоў былі ўмураваны ў корпус манастыра.

**3. Кляштар бернардзінцаў**

Будынак кляштара бернардзінцаў па вуліцы Кірылы І Мяфодзія, 4 быў заснаваны ў 1624 годзе. Фундаваў яго краснасельскі стараста Андрэй Кансоўскі. Першапачаткова кляштар быў драўляны, алё ў канцы 30-х-пачатку 40-х г.г. XVII стагоддзя пачалося будаўніцтва мураванага касцёла і кляштара, якое было скончана ў сярэдзіне стагоддзя. Сёння ў будынку кляштара бернардзінцаў знаходзіцца Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва.

**4. Катэдральны сабор**

На месцы цяперашняго будынка Кафедральнага сабора ў 1633 годзе троцкім ваеводам Аляксандрам Слушкам быў заснаваны кляштар бернардзінак. Ён быў драўляным, алё ў 1642 годзе тут былі пабудаваны мураваныя кляштар І касцёл.

**5. Былая школа езуітаў**

Цяжка ўявіць, што будынак гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі па Плошчы Свабоды, 7 быў ўзведзены ў канцы XVII стагоддзя. Будоўля школы езуітаў была скончана ў 1699 годзе. У студзені 1919 тут размяшчаўся працоўна-сялянскі ўрад Беларусі і пазней прэзідыум ЦВУ БССР. Пасля пажараў XX стагоддзя будынак быў моцна перабудаваны.

**6. Марыінскі Архікатэдральны касцёл**

Былы касцёл езуітаў па Плошчы Свабоды, 9 быў закладзены ў 1700 годзе і асвечаны ў 1710-м. Такім чынам, зусім нядаўна святкавалася 300-годдзе з дня асвяшчэння адной з самых старажытная каталіцкіх святынь. Будынак у розныя гады наведвалі расійскій цар Пётр І, шведскі кароль Карл XII, украінскі гетман Мазепа, імператар Мікалай II. У савецкія часы тут знаходілася спартыўнае таварыства «Спартак».

**7. Палац графоў Пшэздзецкіх**

Па гэтым жа баку вуліцы, па Плошчы Свабоды, 15, стаіць палац графоў Пшыздзецкіх, які быў узведзены ў сярэдзіне XVIII стагоддзя ў стылі барока. Цікавы гарадскі-сядзібны комплекс дайшоў ды нашых дзен з невялічкімі перабудовамі. Унутраная планіровачная прастора тут амаль цалкам захавалася. У савецкія часы тут знаходзіўся Мінскі абласны ваенкамат, пасля - дабрачынны фонд дапамогі воінам-інтэрнацыяналістам "Памяць Афгана".

**8. Упраўленне жыллевай палітыкі мінгарвыканкама**

У раёне Ракаўскага прадмесця ў асноўным захавалася мураваная



Репозиторий ГрГМУ

забудова канца XIX-пачатку XX стагоддзя. А адзін з будынкаў (Вуліца Ракаўская, 14), у якім зараз знаходзіцца ўпраўленне жыллевай палітыкі мінгарвыканкама, датуецца XVIII стагоддзем. Гэта адна з камяніц кляштара кармелітаў, які быў закладзены ў 1703 годзе на ахвяраванні мінскага стольніка і падстарасты Тэадора Антонія Ваньковіча.

**9. Корпус 2-й гарадской клінічнай бальніцы**

Самы стары будынак у раёне Траецкай гары - адзін з карпусоў былога кляштара базыльянак, які быў пабудаваны ў канцы XVIII стагоддзя па праекце архітэктара Крамера. Зараз гэта адзін з карпусоў 2-й клінічнай бальніцы, які выходзіць да ракі Свіслач. Калі ісці каля Кафедральнага сабора, яго можна пабачыць па правым баку вуліцы Багдановіча.

**10. Будынак мінскіх губернскіх устаноў**

Сённяшні будынак абласнога аб'яднання прафсаюзаў па Плошчы Свабоды, 23, а раней будынак мінскіх губернскіх устаноў, быў пабудаваны даволі позна - у 40-х гадах XIX стагоддзя. Алё калісьці на гэтым месцы існаваў кляштар базыльянаў, які быў узведзены ў XVII стагоддзі.

Існуе меркаванне, што фрагменты яго муроў увайшлі ў склад будынака губернскіх устаноў. Яно падмацоўваецца дайшоўшым ды нашых часоў праектам мінскага губернскага архітэктара Казіміра Хрышчыновіча, у якім кляштар базыльянак павінен быў быць умураваны дакладна ў новы будынак. У пачатку XIX стагоддзя тут дзейнічала Мінская гімназія, у якой ў розныя гады вучыліся кампазітар Station Манюшка, гісторык і краязнаўца Аляксандр Ельскі, літаратар Ядвігін Ш і інш.

## Секция «ОБЩЕСТВО»

# ОРГАНИЗАЦИЯ МЕДИЦИНСКОГО ОБЕСПЕЧЕНИЯ ЦАРСКОЙ АРМИИ В ПЕРИОД РУССКО-ЯПОНСКОЙ ВОЙНЫ 1904-1905 годов

УО «Гродненский государственный медицинский университет»
**Борисенко В.М., 3 к., 20 гр., ЛФ**
Военная кафедра
Научный руководитель – ст. преп., подполковник м/с Полуян И.А.

В начале Русско-японской войны 1904-1905 гг. Главное управление *Российского общества Красного Креста* (РОКК) обратилось к населению с призывом о сборе средств на организацию частных санитарных отрядов и лазаретов. На добровольные пожертвования в 1904 г. было организовано